**КРЫНІЦАЗНА́ЎСТВА** літаратуразнаўчае, спецыяльная філалагічная дысцыпліна, якая вывучае крыніцы па гісторыі і тэорыі л-ры, даследуе методыку здабывання, сістэматызацыі і выкарыстання літаратуразнаўчых фактаў. Складаецца з тэарэт. і практычнага аспектаў. Тэарэтычнае К. даследуе прыроду, структуру і ўласцівасці інфармацыі, якая захоўваецца ў сховішчах розных тыпаў (архіў, б-ка, музей). У залежнасці ад тыпу сховішча крыніцы падзяляюцца на 3 віды: рукапісныя, аўдыёвізуальныя і друкаваныя. Значэнне крыніц маюць і прадметы матэрыяльнага характару — адметныя ў творчасці мясціны, рэчы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю пісьменніка. Аднак асн. крыніцамі літ.-знаўчага даследавання выступаюць уласна тэксты маст. твораў — як канчатковыя варыянты, так і чарнавыя накіды. Вельмі важнымі з'яўляюцца дзённікі аўтара, нататнікі, перапіска, а таксама цэнзурныя матэрыялы, успаміны сучаснікаў. Існуюць і т.зв. дапаможныя крыніцы — каментарыі, даведнікі, манаграфіі, артыкулы і інш. Да крыніц адносяць таксама матэрыялы, якія выкарыстоўваў пісьменнік пры напісанні пэўнага тэксту. Практычнае К. складаецца з навук. крытыкі і экспертызы на прадмет сапраўднасці крыніцы, ступені яе захаванасці, адносін да магчымай першакрыніцы. Пры неабходнасці праводзіцца атрыбуцыя, дацiроўка тэксту, высвятляецца месца яго ўзнікнення, ацэньваецца значнасць крыніцы для л-ры і культуры, раскрываецца яе гіст. лёс. Магчыма і т.зв. першасная інтэрпрэтацыя крыніцы — адмежаванне прамога сэнсу інфармацыі ад іншасказальнага, метафарычнага зместу. К. звязана з такімі філал. дысцыплінамі, як бібліяграфія, архівазнаўства, тэксталогія, палеаграфія. Тэарэт. аспекты К. распрацоўваліся Г.Кісялёвым, у галіне практычнага К. працуюць А.Мальдзіс, У.Мархель, В.Рагойша, Я.Янушкевіч і інш.

*Літ.*: Мальдзіс А.В. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры 18 стагоддзя: нарысы быту і звычаяў. Мінск, 1982; Кісялёў Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры 19 ст. 2-е выд. Мінск, 2003; Бандзелікаў М.Ф. Асновы тэорыі і методыкі крыніцазнаўства. 2-е выд. Мінск, 2004.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова